Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 49 (63) | Чацвер, 18 кастрычніка 1945 г.

## Шырэй разгорнем перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва!

Набліжаецца гістарычны дзень—28-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. У гэтым годзе народы нашай краіны будуць адзначаць гэтае вялікае свята пасля пабеданоснага заканчэння другой сусветнай вайны, ва ўмовах мірнага часу.

Народы Совецкага Саюза, натхнёныя велізарнымі перамогамі, з утроенай энергіяй працуюць над ліквідацыяй вынікаў нямецкай акупацыі.

Рыхтуючы дастойную сустрэчу 28 гадавіне Кастрычніка па ўсёй краіне разгарнулася магутная хваля соцыялістычнага спаборніцтва. Першымі ўзнялі сцяг соцыялістычнага спаборніцтва за паспяховае завяршэнне сельскагаспадарчага года, за выкананне ўсіх сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай калгаснікі калгаса ,,Чырвоны хлебароб“, Гомельскага раёна, Гомельскай області. ,, У нас, совецкіх людзей,—пішуць у сваём звароце калгаснікі сельгасарцелі ,,Чырвоны хлебароб“,—ёсць добры звычай—адзначыць свае свята працоўнымі подвігамі. То давайце-ж, таварышы, па совецкаму звычаю разгорнем усенароднае спаборніцтва за дастойную сустрэчу свята Вялікага Кастрычніка!“

Выдатны пачын калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі ,,Чырвоны хлебароб“ аб арганізацыі перадсвяточнага спаборніцтва падхоплен усімі калгаснікамі і сялянамі-аднаасобнікамі рэспублікі.

Многія сельсоветы нашага раёна, як Акцябрскі, Дзеткавіцкі, Худлінскі набліжаюцца да завяршэння хлебапаставак. Акцябрскі сельсовет паспяхова завяршыў сяўбу азімых культур, копку бульбы і здаў 50 процантаў бульбы дзяржаве.

Аднак не ўсе сельсоветы працуюць аднолькава, многія з іх вельмі адстаюць у правядзенні чарговых работ. Да прыкладу можна прывесці Дзераўноўскі, Гарадзецкі, Каменскі сельсоветы, дзе хлебапастаўкі і бульбанарыхтоўкі праходзяць нездавальняючы. У гэтых сельсоветах слаба разгорнута масава-палітычная работа сярод сялян, не арганізавана сярод іх соцыялістычнае спаборніцтва за хутчэйшае заканчэнне ўсіх сельскагаспадарчых работ, за датэрміновае выкананне плана хлебанарыхтовак.

Інтарэсы Радзімы патрабуюць ад сялянства нашага раёна паспяховага разрашэння задач у сельскай гаспадарцы. У бліжэйшыя дні завяршыць хлебапастаўкі па кожнай вёсцы, па кожнаму двару. Неабходна датэрміновa выканаць план бульбапаставак і другіх сельскагаспадарчых прадуктаў, грашовых плацяжоў.

Не меншыя задачы стаяць і перад работнікамі мясцовай прамысловасці. Неабходна ўзорна падрыхтавацца да зімы, значна перавыканаць вытворчы кастрычніцкі план.

Перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва з'яўляецца магучым рычагом у выкананні ўсіх гэтых задач. Задача партыйных, совецкіх, комсамольскіх арганізацый шырэй разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 28 гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі.

Соцыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне плана хлебапаставак

## У барацьбе за хлеб—раўняцца па перадавіках!

**ПЕРАДАВЫЯ СЕЛЬСОВЕТЫ:**

1. Акцябрскі сельсовет (старшыня т. Панасюк).

Сяляне сельсовета на 16 кастрычніка выканалі план хлебанарыхтовак на 96,9 процантаў.

2. Дзеткавіцкі сельсовет (старшыня т. Валынчук).

Сяляне сельсовета выканалі план паставак збожжа на 94,5 процантаў.

3. Худлінскі сельсовет (старшыня т. Труш).

Сяляне сельсовета выканалі план збожжанарыхтовак на 92,1 процантаў.

**АДСТАЮЧЫЯ СЕЛЬСОВЕТЫ:**

1. Дзераўноўскі сельсовет (старшыня т. Грыб).

На 16 кастрычніка выканаў план збожжапаставак на 45,3 процантаў

2. Гарадзецкі сельсовет (старшыня т. Карпінчык).

Сельсовет выканаў гадавы план хлебанарыхтовак на 63,3 процантаў.

## Здаюць хлеб звыш плана

Адказваючы на зварот калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі „Чырвоны хлебароб", Гомельскага раёна аб дастойнай сустрэчы 28-й гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, сяляне Дзеткавіцкага сельсовета павысілі тэмпы здачы дзяржаве паставак сельскагаспадарчых прадуктаў.

Выканаўшы план збожжанарыхтовак, сяляне вёскі Менеўеж здаюць хлеб звыш плана. Бышы воін, які вярнуўся з Чырвонай Арміі ў родную вёску Васілій Карпінчык, здаў у фонд Перамогі 2 пуды, жонка чырвонаармейца Еўдакія Мінчук, Марк Галуц, Патап Каралюк па два пуды і інш.

На пункт Заготзярно паступіла з гэтай вёскі 600 кілограм збожжа звыш плана.

І. Шкроб.

## Выканаць план зяблівага ворыва!

У барацьбе за высокі ўраджай будучага года неацанімае значэнне мае зяблівае ворыва. Ворыва на зіму дапамагае стварыць найбольш спрыяльную для добрага росту раслін структуру глебы, садзейнічае ўзбагачэнню зямлі спажыўнымі матэрыямі, затрыманню вільгаці. Яно з'яўляецца першачарговай умовай барацьбы з пустазеллем.

Зяблівае ворыва дае магчымасць у сціслыя тэрміны правесці веснавую сяўбу.

Там, дзе прыдалі гэтаму важнае значэнне, на сёння мы маем пядрэння вынікі работы. Праяўляючы клопаты аб лёсе ўраджаю будучага года, сяляне Ілаўскага, Каменскага сельсоветаў завяршылі зяблівае ворыва. Паспяхова праходзіць ворыва пад зябліва і ў Галоўчыцкім, Аніскавіцкім і другіх сельсоветах.

Аднак, так справа абстаіць не ўсюды. Напрыклад, Дзямідавіцкі сельсовет выканаў план зяблівага ворыва толькі на 52 процанты, Заніўеўскі—на 55, Першамайскі—на 63 процанты.

Тэмпы зяблівага ворыва павінны быць крута ўзняты. Трэба для гэтай мэты скарыстаць усё цягло, не занятае на вывазцы збожжа і бульбы на нарыхтоўчыя пункты, з максімальнай нагрузкай скарыстаць конна-пракатны пункт МТС. Кіраўнікам сельскіх советаў патрэбна праявіць выключныя клопаты аб сем'ях абаронцаў Радзімы, дапамагчы бяск-нным гаспадаркам узараць пад зябліва.

План, які даведзен нашаму раёну—1.500 гектараў—павінен быць выкапан!

## ЛЕПШУЮ БУЛЬБУ—ДЗЯРЖАВЕ

Завяршылі копку бульбы сяляне Акцябрскага сельсовета. Адначасова са здачай збожжа дзяржаве, тут паспяхова праходзіць вывазка бульбы на нарыхтоўчыя пункты. На 16 кастрычніка з сельсовета пасгупіла дзяржаве 139 тон лепшай бульбы.

* * *

Сяляне Галоўчыцкага сельсовета змагаюцца за паспяховае завяршэнне сельскагаспадарчага года. Закончыўшы копку бульбы, яны здаюць яе дзяржаве. На нарыхтоўчыя пункты паступіла 91 тона бульбы.

## ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

Пастановай Соўнаркома СССР аб дадатковых ільготах сем'ям удзельнікаў Айчыннай вайны прадугледжана крэдытаванне іх на будаўніцтва і аднаўленне жылых дамоў. Сем'ям загінуўшых воінаў, інвалідам Айчыннай вайны і сем'ям ваеннаслужачых пазыкі будуць выдавацца ў тым-жа парадку, які ўстаноўлен у раёнах, пацярпеўшых ад нямецкай акупацыі, для дэмабілізаваных з Чырвонай Арміі. Размер крэдытаў—ад 5 да 10 тысяч рублёў з тэрмінам пагашэння ад 5 да 10 год. На нарыхтоўку матэрыялаў кожнаму атрымаўшаму пазыку выдаецца аванс у размеры 15 процантаў пазыкі. У сельскіх мясцовасцях крэдыты адпускаюцца ўстановамі Сельгасбанка, або Дзяржбанка па рашэннях выканкомаў павятовых, гарадскіх, раённых і валасных советаў дэпутатаў працоўных.

* * *

Беларускія калгаснікі і сяляне-аднаасобнікі праяўляюць вялікія клопаты аб сем'ях ваеннаслужачых і дэмабілізаваных воінаў Чырвонай Арміі. Створаныя ў большасці калгасаў будаўнічыя брыгады адновілі дамы для 75 тысяч сямей абаронцаў Радзімы. Сяляне Заходняй Беларусі апрацавалі зямлю і дапамаглі ўбраць ураджай 100 тысячам сямей ваеннаслужачых.

## ДРАМАТЫЧНЫ ГУРТОК

У вёсцы Кустовічы, Акцябрскага сельсовета, камсамольцы арганізавалі драматычны гурток. Гурток падрыхтаваў і паставіў для сялян п'есу „Курган". Рыхтуюцца да пастаноўкі і другія п'есы.

Актыўны ўдзел у рабоце гуртка прымаюць інвалід Айчыннай вайны Андрэй Крыштафовіч, настаўніца т. Гасюта. **Е. Балдыкаў.**

## ВЫБАРЧЫ ЗАКОН СОВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

У цэнтральных газетах апублікавана „Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР". Гэта—дакумент велізарнай палітычнай важнасці.

У ім выказаны прынцыпы і парадак, якія забяспечваюць кожнаму грамадзяніну нашай краіны свабоднае і поўнае выкарыстанне яго вялікага права выбіраць вышэйшы орган совецкай улады і быць выбраным самому.

У перадавым артыкуле, прысвечаным „Палажэнню аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР", газета „Праўда" указвае: „Артыкулы „Палажэння" з выключнай яснасцю раскрываюць прынцыпы нашай вялікай сацыялістычнай дэмакратыі.

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік—вышэйшы орган дзяржаўнай улады ў СССР—выбіраецца грамадзянамі нашай краіны на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Ні ў адной іншай краіне, не гледзячы на фармальнае ўзглашэнне дэмакратычных прынцыпаў, выбары не бываюць сапраўды ўсеагульнымі, сапраўды роўнымі. У капіталістычных краінах па тых ці іншых прычынах ад удзелу ў выбарах адхіляюцца менш забяспечаныя слаі насельніцтва, людзі, якія належаць да нацыянальных меншасцяў, вельмі часта—салдаты і афіцэры арміі, іншча часцей—палавіна ўсяго насельніцтва—жанчыны.

У совецкай дзяржаве права ўдзельнічаць у выбарах і быць выбранымі маюць усе грамадзяне незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, веравызнання, адукацыйнага цэнза, аседласці, сацыяльнага паходжання, маёмаснага становішча і былой дзейнасці".

Далей „Праўда" піша: „Зараз важнейшай задачай з'яўляецца азнаямленне ўсіх выбаршчыкаў з „Палажэннем аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР". „Палажэнне" павінна стаць здабыткам кожнага рабочага і работніцы, калгасніка і калгасніцы, яно павінна быць вядома кожнаму совецкаму чалавеку".

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

ГЛ 14870 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 2.